**Міхась Болсун**



## У полымі вайны

*Памяці Героя Савецкага Саюза Мікіты Круглікава*

Баі ўзрывалі цішу росных ранкаў,
Ясноту дзён і крохкі сон начэй.
...Ён гнаў вайну ад Кіева на танку
І думаў пра Залессе* і Чачэрск,
Дзе да вайны жыццё бруіла ў хатах,
У святы песня матчына плыла,
Ды наляцелі крумкачамі каты,
Спалілі яго вёсачку датла.
І вестка апаліла болем сэрца,
Віруе прага помсты без мяжы.
У пекла бою экіпаж ірвецца,
Варожыя руйнуе рубяжы.
Святошына** начное ўзята з ходу,
І асядланы на Жытомір шлях.
У тых баях Героем стаў узводны,
Яго крывёй прапітана зямля.
Не вырваўся з драпежных кіпцяў смерці,
Сумуе час: «Няма яго, няма...»
Ды між жывых, нібыта на паверцы,
Гучыць Героя светлае імя.

## Квітней у вяках

Чачора спакойна
  ў бясконцасць цячэ.
Бялее Гайшына пагорак.
Жыве над ракою
  стагоддзі Чачэрск —
Красою аздоблены горад.
Яму я прызнаўся
  ў любові даўно,

---

** Залессе — вёска, радзіма Героя.*
*** Святошына — пасёлак у Кіеўскай вобласці*

Сваім тут хаджу,
а не госцем,
І памяць пракручвае,
нібы ў кіно,
Сюжэты з маёй маладосці.
Квітнелі гады,
як вясною сады,
І мары ляцелі ў нябёсы.
Чарціў я расою
да Сожа сляды,
Разбуджваў там
бляшнямі плёсы.
Хадзіў пакланіцца,
дзе помнік стаіць
Загінуўшым
мужным салдатам,
Ім вечную славу
пяюць салаўі,
Дажджы яшчэ плачуць
па стратах.
І ратушы вежы,
і купал царквы,
І сцены былой сінагогі, —
Такое нідзе
не пабачыце вы,
Прайшоўзшы даўгія дарогі.
Чачора між красак
няспешна цячэ,
Бялее Гайшына пагорак.
Квітней жа ў вяках
над ракою Чачэрск —
Утульны, зялёны мой горад!

## Пачуцці

Над чыстым аркушам паперы
Радкі выспельваю ў цішы,
У іх любоў, надзея, вера —
Пачуцці светлыя душы.
Любоў да злосных не прыходзіць,
Крычаць аб ёй — сабе назло.
Даўно прыкмечана ў народзе,
Дзе ёсць любоў — не трэба слоў.
Калі ж лёс нечым і абдзеліць,
Забуду тое, што было.
Заззяюць іскаркі надзеі,





Апошнім гасне іх святло.
Душа пустэльная без веры,
Казала мама: «З ёй жыві»
...Я адчыняю насцеж дзверы
Надзеі, веры і любві.

## Летнія фарбы

Я іду па зямлі,
Самай любай на свеце:
Сонца сее святло.
Чмель над кветкай гудзе.
У прырэчнай лазе
Дрэмле стомлены вецер.
Ззяе россып лілей
Серабром на вадзе.
Колькі дорыць красы
Мне тут спелае лета,
Дзе паветра — бальзам,
Не шкадуючы, пі!
Гукі, фарбы зямлі
Стануць песняй паэта,
Як прызнанні яго
У сыноўняй любві.

## Лугі-мурагі

(песня)

Дзе лугі-мурагі,
Бусла ў небе кругі,
Дзе Каўпіта*
між лозаў уецца,
Лашчыць плёс берагі, —
Там мой край дарагі,
Там маё прапісалася
сэрца.
І прыходзяць у сны
Зноў і зноў Балсуны**,
Бор смалісты,
блакіт паднябесся,
Лотаць — кветка вясны,
Роўны шнур баразны,
Звон над новай царквой
у Палессі**.

** Каўпіта — рака*
*** Балсуны, Палессе — вёскі ў Чачэрскім раёне*

Як прыеду, прыйду —
П'ю з крыніцы ваду,
Што з мінуўшчыны
панскай завецца...
Праганю ўміг нуду,
На траву ўпаду,
І пяшчотай напоўніцца
сэрца.
Косіць чэрвень лугі
У дзень спякотны даўгі
Водар сена
парфумай разліты...
У вяках, край, жыві,
Кліч у госці, заві
Жаўруковаю песняй
над жытам.

